Выпускаецца ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 11 ліпеня 2019 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прымеркаванага да пасяджэння Міждзяржаўнага савета па супрацьдзеянні карупцыі

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца 11 ліпеня 2019 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прымеркаванага да пасяджэння Міждзяржаўнага савета па супрацьдзеянні карупцыі.

Месца гашэння – Мінск-1.

Колер масцікі – сіні.

Міждзяржаўны савет па супрацьдзеянні карупцыі з’яўляецца органам галіновага супрацоўніцтва Садружнасці Незалежных Дзяржаў і прызначаны ў рамках сваёй кампетэнцыі для забеспячэння арганізацыі і каардынацыі процідзеяння карупцыі.

На пасяджэннях Савета разглядаюцца пытанні ўдасканалення нарматыўнай прававой базы і каардынацыі дзейнасці бакоў у рамках рэалізацыі сумесных праектаў дзяржаў – удзельніц СНД у барацьбе з карупцыяй.

У аснове спецштэмпеля і на канверце – эмблема Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, на канверце таксама – эмблема СНД.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь.

Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А».

Дызайн спецштэмпеля і канверта Таццяны Кузняцовай.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/08-07-2019-4875*